Отчет о реализации проекта
«Наш земляк Иосиф Гошкевич – первый российский консул в Японии»согласно договору от 11 октября 2017 года №40/23408-Д

На реализацию проекта АО ИА «АСЭ» было выделено 68000 российских рублей (2244,00 белорусских рублей). Отчет об использовании денежных средств на реализацию проекта «Наш земляк Иосиф Гошкевич – первый российский консул в Японии» предоставлен в апреле 2018 года.

Согласно плану целевого использования иностранной безвозмездной помощи от 26.01.2018 №03-06/4 в учреждение приобретены предметы длительного пользования - многофункциональное устройство, перфобиндер, ламинатор, диктофон, видеокамера со штативом, стенды.

В Мальском детском саду-начальной школе обновлена экспозиция, посвященная И.Гошкевичу.





Организованы экскурсии, которые включают в себя посещение экспозиции в школе, изготовление журавликов, музейной экспозиции в сельской библиотеке, памятного знака в аг.Мали, места усадьбы И.Гошкевича.






















Разработаны рекламные и информационные буклеты, магнитные сувениры-календари.







Создан видеофильм для виртуальной экскурсии - https://drive.google.com/file/d/1ZlBGadHpye5A2GIgN6cTqz-FXfclAcjd/view

Итоги реализации проекта освещались:
в районной газете «Островецкая правда»


Пераможца VII, XII Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара»
РАЁННАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
АСТРАВЕЦКАЯ ПРАЎДА
№40 (8660)
СУБОТА, 26 мая 2018 г.
www.ostrovets.by Выдаецца з мая 1941 года Цана 75 капеек


# Без сакрэта – усяму свету

**У маёнтку Малі прайшлі апошнія гады жыцця Іосіфа Гашкевіча, першага расійскага консула Расіі ў Японію, дыпламата, місіянера і ўсходазнаўцы. Наш зямляк вядомы як аўтар першага японска-рускага слоўніка, ён лаўрэат поўнай Дзямідаўскай прэміі.**

У гонар гэтага чалавека названа піянерская дружына Мальскага дзіцячага сада – пачатковай школы. Асоба Іосіфа Гашкевіча заўсёды была непахісным прыкладам патрыятызму для нашых школьнікаў, мы сабралі шмат матэрыялу аб жыцці і дзейнасці земляка. А вось каб зрабіць інфармацыю карыснай, даступнай і цікавай для ўсіх, каб мець магчымасць праводзіць інтэрактыўныя экскурсіі і выдаць інфармацыйны матэрыял для наведвальнікаў не хапала матэрыяльных сродкаў.

Дзякуючы перамозе ў конкурсе дабрачынных праектаў АТ ІК АБЭ, нам пашчасціла ператварыць мару ў рэальнасць: ва ўстанове была абноўлена экспазіцыя, прысвечаная Іосіфу Гашкевічу, распрацаваны шэраг экскурсій, якія ўключаюць ў сябе майстар-класы і пешаходныя маршруты, кожны госць атрымлівае на памяць сувенір.

На «знаёмства» з Іосіфам Гашкевічам да нас ужо прыязджалі вучні з астравецкіх і Гервяцкай сярэдніх школ.

Летам мы таксама будзем рады вітаць усіх жадаючых дакрануцца да культуры, акунуцца ў гісторыю сваёй малой радзімы і ў чарговы раз адчуць гонар за сваю краіну – і за славутых землякоў.

**Іна САЛДАЦЕНКАВА, намеснік дырэктара Мальскага НПК.**

на сайте газеты «Островецкая правда»




на сайте Мальского детского сада-начальной школы



в республиканской газете «Настаўніцкая газета»



ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

№ 62 (8114), субота, 2 чэрвеня 2018 года



# Ушанавалі знакамітага земляка

***Наша ўстанова адукацыі знаходзіцца ў аграгарадку Малі. Менавіта тут, у маёнтку Малі, размешчаным паблізу Астраўца, прайшлі апошнія гады жыцця Іосіфа Гашкевіча, першага расійскага консула ў Японіі.***

Іосіф Гашкевіч — выхадзец з Беларусі, расійскі дыпламат, місіянер і ўсходазнавец. Вучоны вядомы як аўтар першага японска-рускага слоўніка, лаўрэат поўнай Дзямідаўскай прэміі і залатога медаля. Піянерская дружына ўстановы носіць імя Іосіфа Гашкевіча.

Дзякуючы ўдзелу і перамозе ў конкурсе дабрачынных праектаў АТ ІК "АСЭ" (Расійская Федэрацыя), на які быў прадстаўлены праект пад назвай "Наш зямляк І.Гашкевіч — першы расійскі консул у Японіі", нам удалося абнавіць экспазіцыю, прысвечаную І.Гашкевічу, распрацаваць і пачаць праводзіць экскурсіі ўжо зусім

Экскурсія ўключае ў сябе знаёмства з экспазіцыяй "Наш зямляк І.Гашкевіч — першы расійскі консул у Японіі", прагляд відэафільма "Адысей з Беларусі", выраб арыгамі "Жураўлік" — сімвала шчасця, наведванне памятнага знака, прысвечанага І.Гашкевічу, работы беларускага скульптара Р.Б.Грушы ў аграгарадку Малі, экспазіцыі ў сельскай бібліятэцы і ліпавай прысадзе, дзе раней стаяла сядзіба І.Гашкевіча. Кожны госць атрымлівае памятны падарунак — магнітны сувенір.

Вельмі радуе, што такая работа актывізавалася ў рамках Года малой радзімы. Спадзяёмся, што нашы экскурсіі дапамогуць дакрануцца да культуры, акунуцца ў гісторыю сваёй малой радзімы і чарговы раз адчуць гонар за сваю краіну.

**Іна САЛДАЦЕНКАВА,**
**намеснік дырэктара**
**па вучэбна-выхаваўчай рабоце Мальскага**
**дзіцячага сада — пачатковай школы**

на сайте газеты «Настаўніцкая газета»



## Ушанавалі знакамітага земляка

05.06.2018 15:53 Культура без каментарыяў

**Наша ўстанова адукацыі знаходзіцца ў аграгарадку Малі. Менавіта тут, у маёнтку Малі, размешчаным паблізу Астраўца, прайшлі апошнія гады жыцця Іосіфа Гашкевіча, першага расійскага консула ў Японіі.**

Іосіф Гашкевіч — выхадзец з Беларусі, расійскі дыпламат, місіянер і ўсходазнавец. Вучоны вядомы як аўтар першага японска-рускага слоўніка, лаўрэат поўнай Дзямідаўскай прэміі і залатога медаля. Піянерская дружына ўстановы носіць імя Іосіфа Гашкевіча.

Дзякуючы ўдзелу і перамозе ў конкурсе дабрачынных праектаў АТ ІК "АСЭ" (Расійская Федэрацыя), на які быў прадстаўлены праект пад назвай "Наш зямляк І.Гашкевіч — першы расійскі консул у Японіі", нам удалося абнавіць экспазіцыю, прысвечаную І.Гашкевічу, распрацаваць і пачаць праводзіць экскурсіі ўжо зусім у новым фармаце.

Экскурсія ўключае ў сябе знаёмства з экспазіцыяй "Наш зямляк І.Гашкевіч — першы расійскі консул у Японіі", прагляд відэафільма "Адысей з Беларусі", выраб арыгамі "Жураўлік" — сімвала шчасця, наведванне памятнага знака, прысвечанага І.Гашкевічу, работы беларускага скульптара Р.Б.Грушы ў аграгарадку Малі, экспазіцыі ў сельскай бібліятэцы і ліпавай прысадзе, дзе раней стаяла сядзіба І.Гашкевіча. Кожны госць атрымлівае памятны падарунак — магнітны сувенір.

Вельмі радуе, што такая работа актывізавалася ў рамках Года малой радзімы. Спадзяёмся, што нашы экскурсіі дапамогуць дакрануцца да культуры, акунуцца ў гісторыю сваёй малой радзімы і чарговы раз адчуць гонар за сваю краіну.

Папулярныя публікацыі

"УКантакце": змагацца нельга выкарыстоўваць
Статыстыка гаворыць: штодзень карыстальнікі сацыяльнай сеткі "УКантакце" націскаюць кнопку "падабаецца" мільярд разоў. Але колькі з...

Андрэй СЕДУН, прарэктар па вучэбнай рабоце БДЭУ: "Дыстанцыйнае навучанне — гэта сучасныя веды ў лічбавым фармаце"
У Беларусі ўжо напрацаваны пэўны вопыт дыстанцыйнага навучання. Чакаецца, што ў новай рэдакцыі Кодэкса аб...

Творчы палілог сталічных студэнтаў
Школьнікі ўжо даўно адгулялі свае вясенні канікулы, не паспеўшы нават як след імі нацешыцца, а...

Я — класны кіраўнік, а гэта значыць...
Лепшым класным кіраўніком на Гомельшчыне названа настаўніца нямецкай мовы сярэдняй школы № 14 Мазыра Алена...

Дызайнер-мадэльер Дар'я Мугака: "Я даўно не сачу за модай. Я ствараю яе сама!"

Увага! Прамая лінія!
ПРЭС-ТУР
НОВЫ ПРАЕКТ ШКОЛА — ДЛЯ БАЦЬКОЎ
Родная зямля
МАЯ ШКОЛА
ЭЛЕКТРОННАЯ ПАДПІСКА
Нашы дадаткі
ПАРТФОЛІА
АБІТУРЫЕНТ
ШОСТЫ ДЗЕНЬ